Калінін С. А. Суадносіны рэлігіі і права на сучасным этапе // Материалы VI Кирилло-Мефодьевских чтений, посвященных дням славянской письменности и культуры, Минск, 25-26 мая 2000 г. / ЕГУ, Министерство культуры Респ. Беларусь. – Минск, 2001. — С. 129-135.

# СУАДНОСІНЫ РЭЛІГІІ І ПРАВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

С. А. Калінін

Сучасны этап развіцця чалавечай супольнасці характарызуецца амаль што поўным афіцыйным прызнаннем канцэпцый праў чалавека і прававой дзяржавы. Гэтыя дактрыны лічацца ўніверсальнымі і прапануюцца як сродак вырашэння асноўных грамадскіх праблем. На наш погляд, існуе актуальная неабходнасць у тэалагічнай характарыстыцы гэтых канцэпцый, што мэтазгодна пачаць з праблем суадносінаў рэлігіі і права. Таксама, значнасць такога даследвання абумоўлена неабходнасцю пераадолець камуністычна-атэістычную спадчыну, а таксама афіцыйным прабачэннем Каталіцкай Царквы за парушэнні праў чалавека і г. д, якое было зроблена 12 сакавіка 2000 года.

Традыцыйна ў агульнай тэорыі права вывучаецца месца права ў сістэме сацыяльных рэгулятараў, якімі лічаць таксама мараль, рэлігію, маральнасць, культуру, карпаратыўныя нормы і г. д. Звычайна права разглядаецца як сістэма агульнаабавязковых, фармальнавызначаных норм, рэгуліруючых найбольш значныя грамадскія адносіны ў галіне палітыкі, эканомікі, сацыяльнага жыцця і г. д. на аснове дамінуючай ў грамадстве ідэальнай мадэлі правамерных паводзінаў, устаноўленых па правілах фармальнай працэдуры спецыяльна упаўнаважаным органам. Сутнасць права звычайна вывучаецца на падставе натуральна-прававога і пазітывістскага падыходаў да вызначэння права.

Канцэпцыя натуральнага права падзяляе права на натуральнае і пазітыўнае, прызнае наяўнасць нейкіх адвечна і незалежна ад чалавечай свядомасці існуючых прынцыпаў і нормаў (правы чалавека, справядлівасць, натуральныя законы і г. д.), якія павінны быць замацаваны ў пазітыўным праве. Тэалагічная школа сутнасці права належыць да гэтага

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

падыхода. Канцэпцыя праў чалавека таксама адносіцца да натуральнага права, але наяўнасць "палітыкі двайных стандартаў" актуалізуе неабходнасць выпрацоўкі адзінага крытэрія тлумачэння праў чалавека, у тым ліку, з пункту гледжання Праваслаўнай Царквы. Пазітывістскі падыход разглядае права толькі як сістэму агульнаабавязковых норм, устаноўленых або санкцыянаваных дзяржавай. Такім чынам, права мае форму і змест. Пад зместам разумеюць пэўныя правілы паводзінаў, пад формай – тыя якасці, якія надаюць норме статус агульнаабавязковай, гарантуюць яе выкананне прымусам дзяржавы. Можна сцвярджаць, што канцэпцыя натуральнага права акцэнтуе ўвагу на змест нормы, а канцэпцыя пазітыўнага права – на яго форму. Неабходна адзначыць, што форма і змест права звычайна супрацьпастаўляюцца, а права ў пэўным выпадку разглядаецца толькі як форма або змест.

Рэлігія як сацыяльны рэгулятар ахоплівае ўсе бакі жыцця грамадства і вызначае адносіны чалавека да Бога і Бога да чалавека, а таксама найбольш дасканалую форму чалавечага жыцця, якое дазваляе дасягнуць выратавання. Неабходна адзначыць, што рэлігія ахоплівае ўсе бакі жыцця пэўнай канфесіі, што абумоўлівае існаванне такіх тэрмінаў як "рэлігійная культура", "кананічнае права", "рэлігійная мараль" і г. д., якія адносяцца да розных сацыяльных рэгулятараў, але маюць адзіны змест і адлюстроўваюць праявы рэлігійнага ў розных сферах чалавечага жыцця. Рэлігійнае вучэнне з'яўляецца тым фактарам, які аб'ядноўвае гэтыя фенамены у адзіную несупярэчлівую сістэму, на падставе адзіных рэлігійных норм і каштоўнасцяў. Рэлігія заўсёды вылучае сваіх вернікаў у асобную супольнасць, права регулюе адносіны паміж усімі грамадзянамі.

У агульным плане рэлігія рэгулюе абавязкі чалавека і правы Бога, вылучаючы Царкву ў якасці Богачалавечай арганізацыі, у якой дзейнічаюць асобныя ад іншага грамадства нормы. Калі разглядаць сацыяльныя рэгулятары як асобныя з'явы, апускаючы іх абумоўленасць

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

нейкімі адзінымі для народа або канфесіі каштоўнасцямі, даследчык у нейкі момант робіць вывад, што грамадскія адносіны адначасова рэгулююцца ўсімі сацыяльнымі рэгулятарамі, якія адпавядаюць розным грамадскім каштоўнасцям, што абумаўляе іх супярэчлівасць. На наш погляд, гэта сведчыць аб наяўнасці першапачатковага сацыяльнага рэгулятара, які вызначаў парадак грамадскага жыцця, а падзел гэтага рэгулятара на права, мараль і г. д. быў зроблены значна пазней.

На нашу думку, універсальным сацыяльным рэгулятарам заўсёды з'яўлялася рэлігія, але падчас гістарычнага развіцця грамадства яна страціла гэты статус. Адказ на гэта пытанне можна зрабіць на падставе параўнання Хрысціянства, Іслама і Іўдаізма. Іслам, рэгулюючы ўсе бакі грамадскага жыцця, выступае фактарам, які абумаўляе змест мусульманскага права, Дзін вызначае Шарыят. Норма, якая не адпавядае законам Шарыяту, не можа дзейнічаць. Такім чынам, ісламскае права ў заходнім разуменні - гэта рэлігійныя нормы, якія рэгулююць найбольш значныя палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і іншыя адносіны. У Іўдаізме старазапаветны закон выступае як рэлігійная норма, якая адлюстроўвае эканамічныя, палітычныя, шлюбна-сямейныя і ўсе астатнія адносіны народа Божага. Такім чынам, рэлігія выступае крытэрыем ацэнкі зместа права, якое выступае знешней формай рэлігійнай нормы. Сучаснае заходняе права пазбаўлена гэтага крытэрія. Рэлігія, за малым выключэннем, не аказвае значнага ўплыву на змест права, тым больш, што свабода сумлення ліквідуе саму магчымасць такога ўплыву з боку адной канфесіі або, наадварот, новыя канфесіі маюць, фактычна, права абмежавання дзейнасці традыцыйных канфесій.

Неабходна адзначыць, што даследчыкі, кажучы пра права, змест якога вызначаецца рэлігіей, разумеюць пад правам тую знешнюю форму, якая вылучае рэгуляцыю найбольш значных сацыяльных адносінаў на падставе нейкіх знешніх прыкмет. Пры даследванні такой знешняй формы

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

не звяртаецца ўвага на рэлігійную сутнасць норм, гэта значыць, што частка разглядаецца ў якасці цэлага. У сучасны момант, звычайна, навука не выкарыстоўвае тэалогію як метад вывучэння грамадства, але на нашу думку, для Праваслаўнай Царквы было б пажадана вызначыць свае адносіны да канцэпцыі праў чалавека і даць ей тэалагічную характарыстыку. Любая канцэпцыя сутнасці права мае свае разуменне зместу права, напрыклад, лічылася, што права павінна адлюстроўваць натуральныя правы чалавека, справядлівасць, агульначалавечыя каштоўнасці, волю народа і г. д., але, на нашу думку, гэтыя катэгорыі з'яўляюцца адноснымі і абумоўлены інтарэсам пэўных асоб або іх груп, што абумоўлівае існаванне "палітыкі двайных стандартаў". Толькі рэлігія можа выступіць як абсалютная каштоўнасць.

Мэтазгодна лічыць, што Хрысціянства не несла пэўнага палітыка-прававога вучэння, а з'яўлялася сродкам асаблівага выратавання. Новы Запавет вядзе гаворку аб адносінах да дзяржаўных інстытутаў, акцэнтуючы ўвагу на паходжанне ўлады ад Бога, і не заклікае да паўстання, кажучы, што «Царство Божие внутри вас есть». Можна пагадзіцца, што разгляд старажытнага Хрысціянства як палітычнай і прававой дактрыны пачаўся значна пазней, калі бакі ў тэалагічных спрэчках пачалі апеліраваць да «першапачатковага Хрысціянства». У савецкі час вывучэнне гэтага аспекта насіла цалкам атэістычны характар і мела сваёй мэтай высвятленне «рэакцыйнасці» Хрысціянства і падтрымкі ім «эксплуататараў». Неабходна адзначыць, што адным з фактараў, які аказаў велізарны ўплыў на гісторыю Заходняй Еўропы, было рымскае права як найбольш дасканалы комплекс норм, регулюючых грамадскія адносіны ў галіне таварна-грашовага абароту на прынцыпах роўнасці бакоў і універсалізма. Спалучэнне юрыдычнага светапогляда рымлянаў і Хрісцыянства з'явілася адным з умоў, на нашу думку, прэтэнзій Рымскага епіскапа на ўладу над Хрысціянскім Светам і ўсей зямлей.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Асноўным дагматам Хрісцыянства ў палітыка-прававой сферы выступае паходжанне ўлады ад Бога, што ў спалучэнні з Траічным дагматам абумовіла з'яўленне так званай "траічнай" тэорыі грамадства. Грамадства па гэтай тэорыі складалася з трох частак: Царква як пастыр, шляхта як сабакі, дапамагаючыя пастыру абараняць статак, а таксама народ як статак, якога неабходна ахоўваць ад драпежных звяроў. Такім чынам, асноўным прынцыпам сацыяльных адносінаў выступала іерархія сацыяльных стратаў і падзел сацыяльных функцый. Гэтая канцэпцыя, а таксама спалучэнне яе з поглядамі Арыстоцеля, што было зроблена Фамой Аквінскім, дазволілі каталіцкай царкве ўплываць на права і палітыку, гэта значыць, рэлігія звычайна разглядалася і выкарыстоўвалася як сродак дасягнення перамогі ў палітычнай барацьбе. Такім чынам, ў нейкі гістарычны момант ў Хрісцыянстве рэлігія і права сталі разглядацца як асобныя сацыяльныя рэгулятары.

Траічная мадэль грамадства перастала адпавядась рэчаіснасці, калі з народу пачаў выдзялацца клас купцоў і буржуазіі. Гэтае саслоў'е, якое мела грошы, але не мела афіцыйных сродкаў уплыва на ўладу, пачало шукаць способы дасягнення палітычнага лідэрства. Але наяўнасць дагмату аб паходжанні ўлады патрабавала ад буржуазіі такога сацыяльнага вучэння, якое б адначасова прызнала гэты дагмат, але б дазволіла абвінаваціць існуючыя ўлады ў парушэнні такога дагмата, у адваротным выпадку - любая нязгода з уладай разглядалася ў якасці бунта . Гэтай канцэпцыяй выступіла канцэпцыя натуральнага права і сацыяльнага кантракту. Не абвяргаючы сутнасці ўлады, было прапанована лічыць, што першапачаткова людзі жылі ў нейкім дадзяржаўным стане, валодаючы ўсімі натуральнымі правамі. Пры гэтым вучовыя па-рознаму характарызавалі такі стан, адны сцвярджалі, што існаваў "залаты век", іншыя – што йшла "вайна ўсіх супраць усіх". Дзяржава ўзнікла ў той час, калі "залаты век" спыніў свае існаванне або людзі стаміліся весці вайну, на

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

падставе сацыяльнага кантракту, па якому людзі стваралі палітычную арганізацыю, перадаючы ёй свае натуральныя правы цалкам або часткова. Па гэтай канцэпцыі грамадства мела права на паўстанне супраць улады, калі тая парушала сацыяльны кантракт.

Такім чынам, першапачаткова не абвяргаючы існаванне Бога і лічачы яго крыніцай натуральных праў, буржуазія атрымала новую палітычную дактрыну. Неабходна адзначыць, што першыя цалкам юрыдычныя вучэнні з'явіліся ў Еўропе толькі ў гэты час. У далейшым гэтая канцэпцыя развівалася на падставе больш атэістычных поглядаў, што прывяло да падзела рэлігіі і права як сацыяльных рэгулятараў. У ходзе буржуазных рэвалюцый канцэпцыя натуральнага права была замацавана ў заканадаўстве, але ў гэты момант кіруючыя колы адмовіліся ад яе далейшага выкарыстоўвання, сцвярджаючы аб супадзенні натуральнага і пазітыўнага права. Такім чынам, асноўнай палітыка-прававой дактрынай XIX - пачатку XX стагоддзя з'уляецца пазітывізм, які разглядаў права ў якасці волі ўлады, сістэмы норм, ёю прынятых. Неабходна адзначыць, што перамога буржуазіі ў барацьбе за ўладу адмоўна паўплывала на суадносіны рэлігіі і права. Права было супрацьпастаўлена рэлігіі. Гэты прынцып быў прынесены ў Расію з Захаду, а потым замацаваны ў камуністычнай тэорыі права. Канцэпцыя праў чалавека пачала выкарыстоўвацца ў палітыка-прававым жыцці пасля Другой Сусветнай вайны, калі ў Нюрнбергу быў асуджаны нацызм, у тым ліку і яго права, якое з пункту погляду пазітывізма з'яўлялася найбольш дасканалым.

На сучасным этапе права як сацыяльны рэгулятар разглядаецца на падставе тэорыі прававой сістэмы ў якасці адносна цэласнага несупярэчлівага комплекса элементаў, рэгулюючых найбольш значныя грамадскія адносіны на падставе мадэлі праваметрных паводзінаў, уласцівых пэўнаму грамадству. Такім чынам, права, якое выступае статычным кампанентам сацыяльна-эканамічнай фармацыі, не можа

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

існаваць без сацыяльных рэгулятараў, якія вызначаюць яго змест. Наданне норме якасці права праводзіцца ў два этапы. У працэсе праваўтварэння вылучаюцца мадэлі сацыяльна-пазітыўных адносін у найбольш значных сферах чалавечага жыцця. У працэсе праватворчасці такой мадэлі надаецца статус права, яна замацоўваецца ў нарматыўным акце. Такім чынам, рэлігія з'яўляецца адным з фактараў праваўтварэння, уплывае на змест норм права. На нашу думку, рост уплыва Праваслаўнай Царквы і рэлігійнасці насельніцтва будзе выступаць станоўчым фактарам развіцця грамадства і рэфармавання права на падставе хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Фактычна, дактрына праў чалавека, якая прэтэндуе на ўніверсальнасць, мае ў сваёй аснове заходнія, ліберальныя, пратэстантскія, індывідуалістычныя і антрапацэнтрычныя каштоўнасці, гэта значыць, абавязак чалавека выконаваць запаветы Хрыста падмяняецца правам адмовіцца ад такога выканання. Неабходна вызначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі назіраецца тэндэнцыя перагляда універсальнасці зместа праў чалавека з пазіцый канфесіянальных і культурных асаблівасцяў. Такім чынам, перад Рэспублікай Беларусь паўстае праблема выпрацоўкі нацыянальнай трактоўкі гэтай дактрыны і Праваслаўная Царква мае як магчымасць, так і абавязак перад вернікамі спрыяць стварэнню праваслаўнай канцэпцыі праў чалавека і абмежаваць уплыў нэапратэстантызму ў Беларусі.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com